СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Бяркові́ч, Т.Л. Музычная культура Беларусі і свету ў разнастайнасці гукавых ландшафтаў / Т. Л. Бяркові́ч, В. Беглик // Навуковыя працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – Минск, 2016. Вып. 37: Символика в балетном жанре (на примере балета «Страсти/Рогнеда/» А. Мдивани). – С. 164–172.

2. Мушинская, Т. М. Валентин Елизарьев / Т. М. Мушинская. – Минск : Беларусь, 1997. – 144 с.

3. Чурко, Ю. М. Линия, уходящая в бесконечность: субъективные заметки о современной хореографии / Ю. М. Чурко. – Минск: Полымя, 1994. – 224 с.

Бруевич В.А., магистрант
дневной формы обучения
Научный руководитель – Смолик А.И.,
доктор культурологии, профессор

## СЕМАНТЫКА АДЗЕННЯ Ў ГАБРЭЙСКАЙ КУЛЬТУРЫ

З прычыны розных знешніх і ўнутраных гістарычных падзей габрэі заўсёды маркіравалі сваё адрозненне ад навакольных, у тым ліку пры дапамозе самага відавочнага сродку – адзення. Тым ні менш даследчыкам дагэтуль схільныя сцвярджаць тэзу, што агульнага нацыянальнага касцюма габрэі не маюць, дадзеная думка гучная. Габрэйскі касцюм – гэта ў чымсьці касцюм той вобласці або краіны, дзе жывуць габрэі: двухтысячагадовая міграцыя накладвала адбітак на знешні выгляд людзей. З сапраўды традыцыйнага адзення ў выніку засталіся толькі “маркеры”, які найбольш выкарыстоўваюцца сярод прадстаўнікоў рэлігійнага свету.

Хоць габрэйскае адзенне фармавалася пад уплывам суседзяў, але заўжды адпавядала чатыром базісным прынцыпам. Першы з іх гучыць наступным чынам “па шляхах іх не хадзіце”. Гэта значыць, што габрэйскае

адзенне не мусіць быць падобная на адзенне іншага народу, у ідышскай культуры замацавалася прымаўка “эх гейт ун гетін ве а гой”, што значыць “ходзе апрануты, як гой” [2].

Другім прынцыпам з’яўляецца цніют (сціпласць) – гэта збор правілаў, якія вызначаюць для веруючай габрэйкі паўсядзённае жыццё, уключаючы і знешні выгляд. Жанчына мусіць максімальна закрываць цела. Адсюль і доўгія жаночыя спадніцы, закрытыя рукі і інш. Асноватворныя паняцці цніюта – жанчына павінна быць цнуа (сціплай) і баалат хесед (чыніць міласэрнасці). Адпаведна, адзенне мусіць быць сціплым, але прыгожым. Неахайнасць, знарочыстая нядбайнасць не адпавядаюць патрабаванням цніюта [7].

Трэццяя ідэя – адзенне мусіць падкрэсліваць ганаровасць і паважаны стан асобы. У Талмудзе сказана, што мудрэц, чыё адзенне знаходзіцца ў непарадку, заслугоўвае смерці. Таму габрэі ва ўсе часы намагаліся пераймаць адзенне навакольнай эліты.

Чацвёрты прынцып і не менш важны – адзенне мусіць сімвалізаваць жалобу па дзвюх зруйнаваных Храмах у Ерусаліме, таму адзенне павінна мець сляды жалобы. Напрыклад, перавага чорнага колеру, трошкі вялікі памер галаўных убораў як прыклад недахопу свайго храма. Варта нагадваць што сінагога не з’яўляецца храмам.

У Сярэднявечча складаецца дастаткова вялікі корпус тэкстаў, які шмат кажа аб семантыцы адзення. Напрыклад, Святы Ары, габрэйскі багаслоў, рабін, містык XVI стагоддзя, які заснаваў "Лурыянскую кабалу", якую сталі вывучаць усе наступныя кабалісты да нашых дзён, піша аб тым, што адзенне чалавека – ад святасці, а здзяйсняемыя ім грахі прыводзяць да таго, што апранаецца ён у кліпот (сілы зла) і трымаюцца кліпот за яго адзенні. Таямніца адзення ўтрымлівае таямніцу святла. вядома, бо ёсць унутранае святло – яно ўнутры і заключана ў целе, і адзенне, навакольнае цела [6].

Гэтая ж ідэя распрацоўваецца пазней з хасідскі вучэнні. Баал-Шэм-Тоў, заснавальнік хасідскага руху ў юдаізме, які жыў у XVIII ст., кажа аб тым, што такія паняткі як гадлут (веліч) і катнут (прыніжэнне) у стане вышэйшых сфірот

адлюстроўваюцца на ўсіх прадметах і з'явах матэрыяльнага свету, у тым ліку і на вопратцы чалавека. Часам здараецца, што кравец псуе пры пашыву адзенне, і гэта засмучае замоўніка, у выніку чаго праяўляецца аспект катнут. Для выпраўлення гэтага варта даць нейкі выкуп. Напрыклад, падарыць гэтае адзенне бедняку, або даць ахвяраванне ў памеры яе кошту [3].

Адзенне і наогул усё, з чым чалавек мае справу, трэба яму для таго, каб падняць іскры, звязаныя з яго душой. Часам гэта праяўляецца ў тым, што ён церпіць страты, таму што пакуль яшчэ не выправіў іскры святасці, а часам да яго прыходзіць прыбытак і тады яго радасць паднімае гэтыя іскры, як піша пра тое святы Ары. У гэтым – патаемны сэнс сказанага: «На ўсіх тваіх шляхах спазнавай Яго» [5]. Усё гэта цесна звязана са згаданымі ў Торы язвамі праказы, якія з'яўляюцца на вопратцы. Гэтыя язвы ўзнікаюць ад “псуты”, якую ствараюць грахі чалавека ў вышэйшых сусветах, а выпраўленне псуты ў тым, што чалавек змывае са свайго адзення язвы праказы і раскайваецца, і тады кожны, агледзеўшы вопратку, прызнае яе чыстым [1].

Напэўна, хасідскае кола, рэлігійная плынь ва іўдаізме, – скарбонка сэнсаў і сімвалаў у адзенні. Хасідскі гардэроб з’яўляецца рэцэпцыяй адзення канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Дагэтуль выкарыстоўваюцца мужчынамі каптаны, штраймлы (галаўны ўбор з футры), гартлы (паясы), сярод жанчын застаюцца ва ўжытку чапцы, актыўна выкарыстоўваецца для вясельных сукенак крыналін, які быў у модзе на пачатку XX стагоддзя. Калі да Другой святовай вайны равіны змагалі з распаўсюдам крыналіну як праявай нясціплага выгляду, то цяпер гэта стала маркерам вытанчанай кашэрнасці і працягам традыцый мінулага.

Не мае сэнсу дэталёва спыняцца на разборы кожнай частцы адзення, бо як ужо адзначалася вышэй, габрэі, жывучы ў дыяспары, стварылі вялікі набор вобразаў, які грунтуецца на адзіных прынцыпах. Таму раглядзем сімвалічны характар “ерусалімскага кафтана” (каптан), які ў найбольшай ступені ўвасабляе габрэйскія каштоўнасці, сэнсы і сімвалы ў шматлікіх дробязя.

Гісторыя яго тая, як і ў большасці адзення, калісьці кафтан быў вымушанай мерай, а цяпер набыў сэнс святасці. Кафтан пашыты з 26 кавалкаў тканіны. Такая колькасць кавалкаў з’яўляецца гематрыяй літар “хоф” і “вав” – лічба боскага імя ці тэтраграматона. Такім чынам, чалавек апранаючы кафтан нібы апранаецца ў боскае імя.

Кафтан па сваё сутнасці ўвасабляе прыхаваны талес ці таліт. Таліт – малітоўнае прамавугольнае покрыва з нітачкамі на вуглах, якія маюць назву “цыцыт”. Адны бачаць у колькасці нітачак і вузялкоў імя бога, іншыя сімвал 613 запаветаў і штодзённы напамін аб іх, бо мужчына мусіць штодня быць насіць таліт-катан у якасці часткі адзення і выкарыстоўвацць таліт-гадоль падчас малітвы [7].

Як ужо адзначалася, кафтан мае своеасаблівы крой, сшыты з аднога кавалка тканіны па прыкладу таліта, дзе правая фанда даўжэй за левую, што сімвалізуе перавагу міласэрнасці над судом, а кафтан – матэрыяльнае ўвасабленне дадзенага прынцыпу.

Палоскі кафтана сімвалізуюць тфілін – элемент малітоўнага ўбору, пара скрыначак, якія змяшчаюць напісаныя на пергаменце ўрыўкі з Торы і якія павязваюцца на лоб і руку. Адна скрыначка мацуеца на плячы левай рукі насупраць сэрца, трохі павярнуўшы да цела, а галаўны тфілу размяшчаецца на лбе, на лініі валасоў, паміж вачэй. Дадзены прынцып адлюстраваўся ў ерусалімскім кафтане, дзе вертыкальныя палосы – свісаючыя раменчыкі галаўнога тфіліна, а гарызантальныя – тфілін, які намотваецца на руку. Лініі на на абшэўках на рукавоў размешчаныя такім чынам, каб з іх адразавалася літара “шын”, бо імя ўсявышняга “Шадай”. Абшлаг на правай руцэ мусіць быць вышэй, чым на левай. Згодна легендам, першыя кафтаны шыліся так, каб яны мелі 72, 63, 45 і 52 палоскі – гэта ўсё лічбавае напаўнне чатырохлітарнага імя бога, якое можа быць запісана па-рознаму [7].

Як бачна нават на прыкладзе кафта, габрэйскае адзенне носіць глыбокасімвалічны характар. У залежнасці ад розных гістыарычных падзей вонкавы вобраз габрэя можа змяняцца, але змест застаецца нязменным.

Прынцыпы габрэйскага адзення, што сфармаваліся ў сярэднявечных тэкстах, а менавіта: не быць падобным на іныш, падкрэслівасць ганаровасць і цніют, пакідаць сляды жалобы, – усё ў гэта праяўляецца найбольш у артадаксальных колах, часткова выконваецца прадстаўнікамі свецкага габрэйскага свету. "Скрутак кніжны напісаны на мне", – кажа цар Давід у псалме, і сапраўды, габрэйскае адзенне падобна на асаблівага роду кнігі, з якіх можна даведацца шмат чаго не толькі аб іх уладальніках, але таксама аб габрэйскім мінулым і сучаснасці [4].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Ваикра: великая тайна маленькой буквы [Электронный ресурс] // Имрей Ноар. – Режим доступа: http://surl.li/fyiwk. – Дата доступа: 25.03.2023.
2. Времена и нравы (еврейский костюм минувших столетий) [Электронный ресурс] // Лехаим. – Режим доступа: https://www.lechaim.ru/ARHIV/159/BAST.htm. – Дата доступа: 20.03.2023.
3. Заключительный Трактат [Электронный ресурс] // Habad.ru. – Режим доступа: https://ru.chabad.org/library/article_cdo/aid/1765450. – Дата доступа: 23.03.2023.
4. Иерусалимский кафтан [Электронный ресурс] // News.ru.co.il – Режим доступа: https://www.newsru.co.il/rest/29may2018/ya_tora_1.html – Дата доступа: 20.03.2023.
5. Мишлей (Книга притчей Соломоновых) [Электронный ресурс] // Толдот. – Режим доступа: https://toldot.com/limud/library/ktuvim/mishlej/. – Дата доступа: 25.03.2023.
6. Раби Яаков-Йосеф Акоэн из Полонного - Иудаизм и евреи [Электронный ресурс] // Толдот. – Режим доступа: https://toldot.com/history/yaakovYosef.html. – Дата доступа: 25.03.2023.
7. Jewish costume - history and influences [Электронны рэсурс] // Jevrejska digitalna biblioteka. – Рэжым доступа: https://jevrejskadigitalnabiblioteka.rs/bitstream/id/4194/RadovanovicJewishCostu